На наших глазах разворачиваются такие процессы, которые заставляют человеческое сообщество переосмыслять сами основы своего существования. Революционные изменения в фундаментальной науке, прежде всего в ее химико-биологическом сегменте, впервые в человеческой истории ставят на повестку дня возможность вмешательства в саму природу человека. Уже сейчас главным аргументом против экспериментов с клонированием человека становятся не внутринаучные аргументы — здесь как раз пределов у человеческого разума нет, — а аргументы ***этические***, связанные с опасением за будущее человечества.

За последние годы мы стали свидетелями процесса глобализации, который не только связал практически все страны мира в единое экономическое, технологическое и информационное целое, но и вообще поставил под вопрос существование государственных границ. Многие умы увидели в развитии процессов глобализации шанс для выстраивания такой системы отношений, которая будет работать во благо всем странам — и развитым, и развивающимся. Однако появляется все больше доказательств, что не так все гладко и с глобализацией, что ее развитие далеко не всегда приводит к сужению пропасти между богатыми и бедными странами и что в новой системе отношений, к сожалению, во многом воспроизводятся старые принципы и приоритеты, когда страны так называемого «золотого миллиарда» и процессы глобализации стремятся поставить на службу себе, своим национальным интересам. Я с глубокой тревогой наблюдаю за развитием движения так называемых антиглобалистов, которое, с моей точки зрения, является внешним проявлением, отражением глубоких внутренних противоречий глобализации, глубокого разочарования результатами глобализации не только на Юге и Востоке, но и на Западе.

Эти волнения, наряду со сложной демографической ситуацией, ростом числа суицидов и многими другими негативными явлениями, показывают, что и в развитых странах также далеко не все так благополучно, как кажется на первый взгляд. Крупнейшие террористические акты в Соединенных Штатах доказали всю эфемерность представления о полной неуязвимости этой страны — главного бастиона западной цивилизации. Но они доказали также и то, насколько важно для всех нас, для всего мира, чтобы эта великая страна продолжала играть свою цивилизационную роль.

Я убежден, в новом тысячелетии любая попытка решать социальные проблемы, социальные конфликты силовым путем обречена на провал. Терроризм, как и антиглобализм, это лишь внешние признаки, знаки, сигнализирующие нам о неблагополучии в глубинных отношениях между странами и культурами. И из этих фактов все мы, но прежде всего богатые государства, должны, просто обязаны сделать соответствующие выводы. Именно сильные должны проявить свою мудрость, своим примером призвать мир к единению.

Время войн и конфликтов кончается, ему на смену идет время единения, время созидания и творения.

Мир меняется на наших глазах, однако далеко не всегда мы понимает направленность этих изменений и поэтому слишком часто не можем предсказать последствия своих поступков. Очевидно одно — время простых решений безвозвратно уходит. В такой ситуации в поисках ответа на наиболее фундаментальные вопросы, волнующие и все человечество, и отдельные нации вполне оправданно обращение к тем социальным институтам, которые на протяжении веков аккумулировали человеческие знания и опыт, сумели выработать такую систему ценностей, такую систему межчеловеческих отношений, которая в определенном смысле может быть образцом для выстраивания отношений в обществе будущего.

И далеко не случайно, что практически в каждой развитой стране современного мира есть университет, который выполняет роль хранителя главных национальных ценностей, чье имя, становление и развитие неотделимо от истории становления и развития данной нации.

Юбилей — хороший повод для того, чтобы проанализировать достижения, наметить пути дальнейшего развития.

Белорусский государственный университет всеми своими делами подтверждает высокий статус национального университета. Сегодня, наверное, не найдется ни одного крупного предприятия или научно-исследовательского института, ни одной школы или другого образовательного учреждения, в конце концов, ни органа управления в стране, где не работали бы наши выпускники. Это огромная армия высококвалифицированных специалистов, которая может и должна служить образцом не только творческого отношения к труду, но и образцом гражданственности, высокой морали для всего белорусского общества.

Нам многое дано, однако и спрос с тех, кому много дано, всегда особый. Оказывая помощь университету, государство надеется, что национальный университет станет образцом успешных реформ для белорусского общества, тем маяком, который в новом веке укажет нашей стране путь в сообщество наиболее развитых стран.

Сотрудники и выпускники БГУ немало сделали для страны. Но гораздо больше нам с вами предстоит сделать. Страна ждет от нас прорыва на качественно новый уровень и в сфере образования, и в научных исследованиях, и в инновационной сфере. Роль университетского сообщества в жизни страны может и должна быть еще более существенной.

Общество нового тысячелетия не может быть построено без учета законов этики и эстетики, законов гармонии и красоты. Университет, который на протяжении веков стремился к тому, чтобы гармонизировать в человеческой деятельности все основные ее начала, включая этические и эстетические, как никакой другой социальный институт способен ответить на вызовы нового тысячелетия.

Это тем более важно осознавать сейчас, когда наша страна устремлена в будущее, вступает в новый этап своего развития, связанный с дальнейшим развитием интеллектуального потенциала, либерализацией экономики, расширением и укреплением международных связей.

Я ни минуты не сомневаюсь, что педагоги и ученые, студенты и аспиранты, все выпускники БГУ с честью будут и дальше нести знамя лучшего вуза страны, кузницы национальной элиты. И не только как специалисты, но и как члены университетского сообщества, готовые через всю жизнь пронести свет, зажженный в их сердцах приобщением к нашим общим традициям и ценностям. Убежден, вы понимаете и принимаете служение Отечеству, служение Истине не только как послушание, но и как величайший дар, приобщающий жизнь каждого из нас к Вечному, к тому, что придает высший смысл индивидуальному человеческому существованию.

Дорогие друзья!

В своем выступлении я сознательно ухожу от того, чтобы называть чьи-либо фамилии. В нашем коллективе тысячи и тысячи людей, достойных не только упоминания, но и отдельного рассказа. Они придерживаются различных, зачастую полярных взглядов, и это нормально. Более того, университет сознательно культивирует многообразие точек зрения. Это необходимая предпосылка и педагогического, и научного творчества. Невозможно представить современный университет, в котором царит единомыслие. Он просто не сможет развиваться и погибнет.

Но все мы едины в главном — в признании фундаментальных ценностей университетского сообщества, в приверженности духу университета, духу творчества и высокой нравственности.

Во время подписания Договора о научном, учебном и культурном сотрудничестве между БГУ и МГУ на торжественном собрании, посвященном юбилею
Фото Андрея Дука

Я поздравляю всех вас с юбилеем, желаю дальнейших успехов в нелегком, но таком почетном труде.

Не могу не сказать также слова благодарности всем друзьям БГУ, кто приехал или пришел на этот праздник, кто совершенно бескорыстно помог нам его организовать или просто поздравил теплым словом. Их много, и искренне радует, что с каждым днем друзей у БГУ становится все больше как в стране, так и за ее пределами. Вашу помощь, ваши теплые слова мы воспринимаем и как оценку своей работы, и как аванс на будущее, который еще предстоит отработать. Заверяю вас — мы к этому готовы.

ВІНШУЕМ!

(Працяг. Пачатак на 2-й стар.)

інжынер I катэгорыі гаспадарчага аддзела Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Н.Г. Разуваева;

загадчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта, доктар філалагічных навук І.С. Роўда;

прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта, доктар гістарычных навук В.Н. Рабцэвіч;

загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі, кандыдат філалагічных навук Л.П. Саянкова;

загадчык кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі А.К. Свораб;

дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце, кандыдат геаграфічных навук Г.С. Смалякоў;

загадчык кафедры інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, доктар фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік В.Б. Таранчук;

загадчык лабараторыі ядзернай оптыкі НДІ ЯП, доктар фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік В.В. Ціхаміраў;

дацэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук А.Л. Тоўсцік;

загадчык кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, доктар фізіка-матэматычных навук М.М. Труш;

загадчык лабараторыі аптычных сродкаў вымярэнняў Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы Л.М. Турышаў;

прафесар кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук, доктар гістарычных навук П.П. Украінец;

галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі люмінісцэнцыі НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Д.С. Умрэйка;

намеснік дырэктара Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Л.З. Утко;

галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі фатонікі НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А.П Хапалюк;

галоўны навуковы супрацоўнік НДЧ, доктар тэхнічных навук А.Л. Халмецкі;

дацэнт кафедры міжнародных адносінаў, намеснік дэкана факультэта міжнародных адносінаў, кандыдат гістарычных навук Л.М. Хухлындзіна;

загадчык кафедры біяфізікі фізічнага факультэта, доктар біялагічных навук С.М. Чаранкевіч;

прафесар кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта, доктар геаграфічных навук М.К. Чартко;

прафесар кафедры міжнародных адносінаў, намеснік дэкана факультэта міжнародных адносінаў, доктар гістарычных навук М.Э. Часноўскі;

загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі хімічнага факультэта, доктар хімічных навук А.І. Шадыра;

загадчык кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук В.Я. Ямны;

намеснік начальніка НДЧ, вучоны сакратар, кандыдат фізіка-матэматычных навук А.М. Янкоўскі.

Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя:

загадчыца кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта, кандыдат філалагічных навук З.І. Бадзевіч;

старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту А.С. Балдзін;

загадчык лабараторыі НДІ ЯП, кандыдат тэхнічных навук М.А. Батурыцкі;

дацэнт кафедры эканамічных навук эканамічнага факультэта, кандыдат эканамічных навук А.І. Бераснева;

прафесар кафедры міжнароднага права факультэта міжнародных адносінаў, доктар юрыдычных навук Ю.П. Броўка;

дацэнт кафедры агульнай фізікі фізічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук Л.І. Бураў;

дацэнт кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта, кандыдат хімічных навук А.І. Васілеўская;

камендант вучэбнага корпуса журфака Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Л.К. Вінакурава;

прафесар кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта, доктар хімічных навук Т.М. Вараб'ёва;

загадчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Я.С. Варапай;

загадчык кафедры дынамічнай геалогіі геаграфічнага факультэта, доктар геаграфічных навук В.М. Губін;

дацэнт кафедры раманскіх моў, кандыдат філалагічных навук Ж.І. Дронская;

загадчыца кафедры англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў факультэта міжнародных адносінаў, кандыдат філалагічных навук, дацэнт С.А. Дубінка;

загадчык кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук, доктар філасофскіх навук, прафесар А.М. Елсукоў;

старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту М.А. Жаўнерка;

загадчык кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі механіка-матэматычнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук М.А. Жураўкоў;

загадчыца лабараторыі НДЧ, кандыдат тэхнічных навук Л.А. Залатарэвіч;

(Заканчэнне на 7-й стар.)

ЗАПРАШЭННЕ

Фальклорная вечарына

Унікальная навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ адзначае сваё 20-годдзе. Лабараторыя гэта незвычайная, таму і свой юбілей яна будзе адзначаць не зусім традыцыйна — навукова-творчай вечарынай, якая пачнецца а 16 гадзіне 7 снежня ў актавай зале філфака (вул. К. Маркса, 31).

З прамовамі на вечарыне выступяць дэкан філалагічнага факультэта член-карэспандэнт АПН Беларусі Л.А. Мурына, заснавальнік фальклярыстычнай працы ў БДУ прафесар Н.С. Гілевіч, загадчык кафедры тэорыі літаратуры доктар філалагічных навук В.П. Рагойша, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і культуры, а таксама "гаспадар свята" — загадчык НДЛ беларускага фальклору кандыдат філалагічных навук Васіль Ліцьвінка. Прагучаць віншавальныя словы ад Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, ад іншых ВНУ нашай краіны, былых і цяперашніх супрацоўнікаў лабараторыі, ад прадстаўнікоў выдавецтваў, часопісаў, газетаў, радыё і тэлебачання.

Незвычайную ноту вечарыне нададуць выступы творчых калектываў з песенна-фальклорнымі віншаваннямі, якія будуць гучаць паміж выступамі прамоўцаў. Тут можна будзе пабачыць тэатр фальклору "Матуліна песня" (Гродзенскі раён), фальклорны ансамбль "Медуніца" (Лёзненскі раён Віцебскай вобласці), фальклорныя калектывы "Прыпяць" і "Новае жыццё" (Жыткавіцкі раён Гродзенскай вобласці), "Асалода" (Барысаўскі раён), "Вячоркі", "Тутэйшая шляхта", "Неруш", "Крэсіва", "Грамніцы", "Ліцьвіны", "Гасцінец" і інш. Апроч творчых калектываў выступяць Заслужаныя артысты Беларусі Васіль Купрыяненка, Святлана і Уладзімір Салодкія, спевакі Тамара Ліхадзіеўская, Міхась Пацук і іншыя выканаўцы народных песень з усёй Беларусі.

Вольга АНІНА

З НАГОДЫ

Школа сапраўдных мужчын

Роўна 75 год таму, 4 лістапада 1926 года Рэўваенсавет СССР выдаў загад № 670 аб утварэнні ваеннай кафедры ў БДУ. Першым яе кіраўніком стаў М.М. Пятроў — патомны вайсковец. Крыху пазней, у 1926-31 гадах, падчас службы ў Беларускай вайсковай акрузе, пазаштатным выкладчыкам кафедры працаваў Г.К. Жукаў. Заняткі на спецкафедры прыпыніліся ў 1941 годзе, але ўжо праз два гады пачаліся зноў.

Сёння ваенная кафедра рыхтуе афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях. Для навучання студэнтаў прыцягваюцца толькі высокакваліфікаваныя кадры, і сведчанне гэтага — шматлікія ордэны, медалі і іншыя дзяржаўныя ўзнагароды, атрыманыя многімі афіцэрамі. Больш за 25 год працуе тут А.К. Кашавы, зараз майстар вытворчага навучання, узнагароджаны ордэнам "Знак пашаны" за навучанне і выхаванне афіцэраў запасу. Акрамя таго, многія з сённяшніх выкладчыкаў кафедры, напрыклад У.М. Кудрэйка, А.Р. Шкураў, А.В. Лашук, А.Д. Міронаў, В.А. Жалняркевіч, Ю.А. Галаўцоў, прайшлі праз полымя вайны ў Афганістане, а А.М. Чысцякоў прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС.

Увесь час свайго існавання ваенная кафедра была цесна звязана з універсітэтам. Так, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза генерал-маёр А.В. Кірсанаў з 1 жніўня 1955 года па 17 верасня 1960 года служыў начальнікам спецкафедры БДУ, а ў 1960-1974 гадах працаваў прарэктарам універсітэта. А сёння цыкл баявога прымянення мотастралковых падраздзяленняў, часцей і злучэнняў і цыкл прававой і выхаваўчай работы ўзначальваюць выпускнікі геафака БДУ, палкоўнікі А.В. Лашук і В.У. Таляронак.

З 1936 года асноўнай формай працы са студэнтамі на ваеннай кафедры сталі заняткі ў аўдыторыях, ціры, полі і вайсковых часцях. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, гэтая традыцыя захоўваецца і сёння: сёлета падчас вайсковых збораў студэнты цыкла БП МПЧЗ выконвалі стралковыя практыкаванні з усімі відамі стралковай зброі, якая ёсць у беларускім войску. Акрамя таго, стойкасць, мужнасць і сумленныя адносіны да сваёй справы, выхаванню якіх тут надаецца шмат увагі, спатрэбяцца выпускнікам кафедры і ў далейшым жыцці.

Напрыканцы хацелася б павіншаваць ад імя усіх выпускнікоў і студэнтаў выкладчыкаў ваеннай кафедры са святам, пажадаць ім далейшых поспехаў і мірнага неба над галавою.

Вадзім ЗУБРЫЦКІ,
студэнт V курса геафака,
выпускнік цыкла БП МПЧЗ 2001 года

АБ'ЯВЫ

Навукова-даследчая ўстанова "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:

галоўнага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці "арганічная хімія";

вядучага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці "радыёфізіка";

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці "радыёфізіка";

малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці "вылічальная матэматыка".

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Дакументы накіроўваць на адрас:
г. Мінск, вул. Курчатава, 7.
Тэл. 277-48-43, 277-56-17.

Інстытут ядзерных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЛАБАРАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНАЙ ФІЗІКІ
галоўны навуковы супрацоўнік — 1 чалавек;

ЛАБАРАТОРЫЯ ВЫМЯРАЛЬНЫХ СІСТЭМ
малодшы навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220050, г. Мінск, НДІ ЯП, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, класічнай філалогіі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва, крыніцазнаўства, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Расіі, метадаў аптымальнага кіравання;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі, ядзернай фізікі, матэматычнай фізікі, фізіялогіі і біяхіміі раслін, аналітычнай хіміі, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, філасофіі культуры, псіхалогіі, сацыялогіі, класічнай філалогіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, славянскіх літаратур, крыніцазнаўства, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, міжнародных адносін, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, экалагічнага і аграрнага права, крыміналістыкі, паліталогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння АСК, класічнай філалогіі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, эканамічных навук, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, раманскіх моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: філасофіі культуры, псіхалогіі, сацыялогіі, класічнай філалогіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, раманскіх моў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: ядзернай фізікі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, інтэлектуальных сістэм, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

СЕМІНАРЫ

Еўра і Беларусь

Напрыканцы верасня ў Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі прайшоў семінар на тэму "Уплыў еўра на еўрапейскія фінансавыя рынкі". Семінар праходзіў у рамках рэалізацыі праекта "Павышэнне магчымасцяў Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі — стварэнне сістэмы распаўсюджвання інфармацыі пра дзейнасць еўрапейскіх супольнасцяў і спрыянне еўрапейскім даследаванням", які ажыццяўляецца па праграме ТАСІС "Развіццё грамадзянскай супольнасці". Па словах дырэктара Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Юрыя Чабатарова, у рамках семінару абмяркоўваліся асноўныя аспекты ўвядзення наяўнага еўра, уплыў новай еўрапейскай валюты на розныя фінансавыя рынкі, валютныя аблігацыі каштоўных папер, магчымае ўздзеянне ўвядзення еўра на краіны, якія не ўваходзяць у Еўрапейскі валютны саюз, а таксама перспектывы і наступствы пераходу на наяўныя еўра для Рэспублікі Беларусь.

Удзельнікі семінару выслухалі выступы прафесара факультэта эканомікі універсітэта Турына (Італія) спадарыні Паулы дэ Вінчэнціс і саветніка прэзідэнта ААТ "Белзнешэканамбанк" Дзмітрыя Курачкіна.

Пасля выступаў адбыліся дыскусіі, дзе абмяркоўваліся наступныя праблемы: абмен фізічнымі асобамі наяўных і безнаяўных ашчаджэнняў у нацыянальных валютах краін Еўрапейскага валютнага саюза на еўра; перавод усіх доларавых разлікаў некаторых краін (якія ўваходзяць і не ўваходзяць у Еўрапейскі валютны саюз) на еўра і магчымыя наступствы такой палітыкі для эканомікі гэтых краін; магчымасць паступовага выцяснення долара з рынку безнаяўных разлікаў.

Т. КУХАРЧУК

АДУКАЦЫЯ

Турыстаў рыхтуюць у БДУ

З кастрычніка пачала свой другі навучальны год Вышэйшая школа экскурсаводаў і менеджэраў турызму Беларускага дзяржаўнага універсітэта, створаная па прапанове Міністэрства спорту і турызму Беларусі дзеля перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі турысцка-экскурсійных кадраў. Разам са спецыяльнымі "турысцкімі" курсамі, навучальны працэс уключае блокі гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, агульнанавуковых і агульнапрофільных дысцыплін, вытворчыя практыкі і навучальныя экскурсіі (у тым ліку і за мяжу), што дае магчымасць выпускнікам школы адчуваць сябе поўнасцю падрыхтаванымі для турысцкага бізнесу.

Навучанне ажыццяўляецца на платнай аснове на вячэрняй і завочнай формах. Заняткі вядуць высококваліфікаваныя выкладчыкі і спецыялісты структурных падраздзяленняў БДУ (Вышэйшай міжнароднай школы бізнесу і менеджменту тэхналогій, геаграфічнага, гістарычнага, філалагічнага факультэтаў, факультэта міжнародных адносінаў і г.д.), Міністэрства спорту і турызму, "Беларустурыста" і іншых арганізацый.

Сёлета ж у кастрычніку адбыўся і першы выпуск слухачоў па спецыяльнасцях "менеджэр турызму", "экскурсавод", "кіраўнік турысцкай групы". Ва ўмовах устойлівага развіцця турызму, пашырэння міжнародных сувязяў, павышэння патрабаванняў да кваліфікацыі турысцкіх кадраў Вышэйшая школа экскурсаводаў і менеджэраў турызму БДУ запрашае студэнтаў старшых курсаў паралельна атрымаць сучасную спецыяльнасць, якая карыстаецца нязменным попытам.

Адрас Вышэйшай школы экскурсаводаў і менеджэраў турызму БДУ: вул. Ленінградская, 16 (корпус геаграфічнага факультэта), пакой 108, тэл. 209-54-38.

У.М. ЗАЙЦАЎ,
дырэктар Вышэйшай школы экскурсаводаў і менеджэраў турызму БДУ, дацэнт

САКРЭТ ФІРМЫ

Нікуды Беларусь ад турызму не сыдзе

Напрыканцы верасня, напярэдадні Міжнароднага дня турызму, для студэнтаў спецыялізацыі "менеджмент у сферы міжнароднага турызму" факультэта міжнародных адносінаў прайшлі "Турысцкія чытанні". Гасцямі сёлетніх чытанняў сталі начальнік упраўлення турызму Міністэрства спорту і турызму Уладзімір Кушчыенка і дырэктар турысцкай кампаніі "СМОК" Рафаэль Мусаеў.

Даклад У. Кушчыенкі датычыўся сучаснага стану сферы турбізнесу і магчымасцяў яе развіцця ў бліжэйшай будучыні. Зараз турызм у нашай краіне перажывае далёка не лепшыя часы, таму асаблівы акцэнт быў зроблены на праблеме стварэння "Праграмы развіцця турызму на 2001-2005 гады" і Нацыянальнага турысцкага агенцтва, якія мусяць забяспечыць эфектыўнае развіццё турызму і кіраванне турысцкай дзейнасцю ў Беларусі. Важным накірункам развіцця Уладзімір Мікалаевіч назваў "інфармацыйнае напаўненне" галіны: выданне даведнікаў, альбомаў, картаў, брашураў, выхад тэлевізійных праграмаў, прысвечаных культуры і гісторыі краіны. Пры гэтым вялікае значэнне мае выхад на маладое пакаленне. "Нікуды Беларусь ад турызму не сыдзе!" — запэўніў выступоўца ўсіх прысутных.

Рафаэль Мусаеў, дырэктар турысцкай кампаніі "СМОК", звярнуўся да аўдыторыі як да патэнцыйных супрацоўнікаў турысцкіх фірмаў: ён падзяліўся прафесійным і асабістым досведам. Вельмі важным ён назваў пытанне пра якаснае навучанне і перанавучанне супрацоўніка фірмы, пра яго культуру і прафесійную этыку. Уся прамова была праілюстраваная прыкладамі з практыкі "СМОКа". Р. Мусаеў, як і папярэдні выступоўца, звярнуў увагу на вялікую важнасць інфа- і прэстураў па Беларусі. Наша краіна мае вялікі турысцкі патэнцыял (напрыклад, экалагічны турызм), але патрабуюцца нетрадыцыйныя падыходы да яго асваення.

Потым госці чытанняў удзельнічалі ў абмеркаванні выступаў студэнтаў. Студэнтка чацвёртага курса Дар'я Бароўская выступіла з дакладам, прысвечаным канцэпцыі ўстойлівага турызму, якой надаецца ўсё больш увагі ў сучаснай практыцы. Аксана Глубокая прадставіла аналіз навучальнай экскурсіі па маршруце Мінск — Бярэзінскі запаведнік — Полацк — Мінск, якая напярэдадні праводзілася для студэнтаў трэцяга курса. Студэнт трэцяга курса Ігар Шаршуноў выступіў з дакладам, напісаным па выніках яго ўдзелу ў рэкламным туры, арганізаваным ПКТ ААТ "Подевюс". Закончыў чытанні выступ трэцякурсніка Андрэя Барашкі — кіраўніка самадзейнага экспедыцыйнага праекта "Беларусь у чатыры нагі". Вынікі сваёй працы ўдзельнікі праекта змяшчаюць на ўласным сайце ў Інтэрнэце (www.4feet.f2s.com; e-mail: heimat@tut.by).

Госці выказалі падзяку студэнтам за іх прафесійную цікавасць да праблемаў і перспектываў турызму. У сваю чаргу, студэнты падзякавалі гасцям за цікавыя выступы, а прадстаўнікі кафедры міжнароднага турызму паабяцалі зрабіць "Турысцкія чытанні" традыцыйнымі на факультэце.

Андрэй БАРАШКА,
студэнт III курса
факультэта
міжнародных адносін

КАНФЕРЭНЦЫІ

Камп'ютэрны аналіз

У верасні ФПМІ разам з Нацыянальным навукова-даследчым цэнтрам прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, Беларускім фондам фундаментальных даследаванняў і Беларускай статыстычнай асацыяцыяй арганізаваў 6-ю Міжнародную канферэнцыю "Камп'ютэрны аналіз даных і мадэляванне". У канферэнцыі ўдзельнічалі больш за 100 спецыялістаў з 15 краінаў свету (Аўстрыя, Балгарыя, Вялікабрытанія, Германія, Латвія, Літва, Польшча, Расія, Швейцарыя, Японія і інш.). У рамках канферэнцыі быў арганізаваны семінар па праблемах камп'ютэрнага эканаметрычнага мадэліравання, аналізу і прагназавання эканамічных і фінансавых працэсаў для выкладчыкаў і спецыялістаў беларускіх ВНУ і арганізацый.

Апрача навукоўцаў, у мерапрыемстве ўдзельнічалі студэнты трэцягапятага курсаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Ю.С. ХАРЫН,
прафесар, сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі

Памяці Аркадзя Смоліча

У верасні ў нашым універсітэце праходзіла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Тэарэтычныя і прыкладныя праблемы геаэкалогіі", прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага навукоўца Аркадзя Смоліча. На канферэнцыі, арганізаванай геаграфічным факультэтам БДУ і Беларускім геаграфічным таварыствам, разглядаліся метадалагічныя праблемы рацыянальнага прыродакарыстання і аптымізацыі навакольнага асяроддзя; прыкладныя аспекты аптымізацыі ўзаемадзеяння чалавечай супольнасці і прыроды; геаэкалогія прыродных і прыродна-антрапагенных геасістэм; ацэнка, мадэляванне і прагноз наступстваў антрапагеннага ўплыву на навакольнае асяроддзе.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел не толькі беларускія навукоўцы, але і спецыялісты з Літвы, Польшчы, Расіі, Узбекістана, Украіны.

Вадзім ЗУБРЫЦКІ

Вакуумнаму таварыству - быць?

У кастрычніку ў БДУ прайшла навуковая канферэнцыя "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам". Уздымаліся такія пытанні, як працэсы ўзаемадзеянныя іонаў з цвёрдым целам, узаемадзеянне плазмы з паверхняй, радыёактыўныя эфекты ў цвёрдым целе, мадыфікацыя ўласцівасцяў матэрыялаў, абсталяванне і тэхналогіі. Удзел у канферэнцыі ўзялі навукоўцы з Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны. У рамках мерапрыемства праходзіў VI беларуска-польскі сімпозіум "Вакуумная тэхніка і тэхналогіі".

На канферэнцыі была выказана прапанова стварыць Беларускае вакуумнае таварыства.

Алена КУРХІНЕН

ПАДПІСКА—2002

"Веснік БДУ"

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2002 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:

Серыя I (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):
індывідуальная — 3454 р.;
ведамасная — 6738 р.

Серыя II (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):
індывідуальная — 3454 р.;
ведамасная — 6738 р.

Серыя III (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):
індывідуальная — 1727 р.;
ведамасная — 3369 р.

Серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):
індывідуальная — 1727 р.;
ведамасная — 3369 р.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса

Часопіс для сацыёлагаў і палітолагаў

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2002 года. Часопіс "Сацыялогія" — першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі і паліталогіі, якое выдаецца з 1997 года. Заснавальнік часопіса — Беларускі дзяржаўны універсітэт.

На старонках часопіса прадстаўляюцца тэарэтычныя, метадычныя, інфармацыйныя матэрыялы, даныя пра вынікі прыкладных сацыялагічных даследаванняў, хроніка асноўных падзей у навуковым сацыялагічным жыцці, звесткі пра дысертацыі, абароненыя ў Беларусі па сацыялогіі і паліталогіі.

Спецыяльны раздзел прысвечаны аспіранцкім даследаванням.

У ліку аўтараў часопіса вядучыя сацыёлагі і палітыкі Рэспублікі Беларусь, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і г.д.

"Сацыялогія" ўваходзіць у лік выданняў, зацверджаных прэзідыумам ВАК Беларусі пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі і паліталогіі, а таксама сумежных галінаў навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Падпісны індэкс часопіса: для індывідуальных падпісчыкаў — 74932, для прадпрыемстваў і арганізацый — 00245.

Падпісная цана на часопіс "Сацыялогія" на першае паўгоддзе 2002 года:

1 квартал (3 месяцы): індывідуальная — 1430 руб., ведамасная — 2860 руб.;

2 кварталы (6 месяцаў): індывідуальная — 2860 руб., ведамасная — 5720 руб.

Падісацца на часопіс "Сацыялогія" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь (у продаж выданне паступае ў абмежаванай колькасці).

Рэдакцыя часопіса "Сацыялогія"

ВІНШУЕМ!

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

загадчык кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі геаграфічнага факультэта, доктар геаграфічных навук, прафесар В.Н. Кісялёў;

загадчыца кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці геаграфічнага факультэта, доктар эканамічных навук, прафесар Л.В. Казлоўская;

прафесар кафедры гісторыі беларускай мовы філалагічнага факультэта, кандыдат філалагічных навук В.П. Красней;

начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы І.П. Латушка;

дацэнт кафедры батанікі біялагічнага факультэта, кандыдат біялагічных навук М.А. Лямеза;

прафесар кафедры аналітычнай хіміі хімічнага факультэта, доктар хімічных навук С.А. Мячкоўскі;

дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносінаў факультэта міжнародных адносінаў, кандыдат эканамічных навук А.А. Нячай;

начальнік аддзела асабовага саставу ўпраўлення кадраў Н.Т. Няпеўная;

дацэнт кафедры біяхіміі біялагічнага факультэта, кандыдат біялагічных навук Н.М. Арол;

намеснік дэкана па навуковай рабоце факультэта журналістыкі, кандыдат гістарычных навук А.А. Плаўнік;

старшы выкладчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі Т.І. Прановіч;

вядучы навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі арганічнай хіміі НДЧ, кандыдат хімічных навук Т.С. Прытыцкая;

прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта, кандыдат гістарычных навук І.Ф. Раманоўскі;

загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар В.М. Русак;

дацэнт кафедры эканамічнай навук эканамічнага факультэта, кандыдат эканамічных навук М.У. Саковіч;

дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта, кандыдат педагагічных навук І.М. Саматыя;

загадчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі, доктар гістарычных навук І.І. Сачанка;

старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В.В. Себва;

прафесар кафедры арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ хімічнага факультэта, доктар хімічных навук Л.С. Станішэўскі;

загадчык лабараторыі НДІ ЯП В.І. Сталярскі;

дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі фізічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук Я.А. Ушакоў;

загадчык кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі механіка-матэматычнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар В.С. Федасенка;

прафесар кафедры гісторыі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта, кандыдат філасофскіх навук П.А. Шупляк.

Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя:

намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення навукі, кандыдат фізіка-матэматычных навук Т.А. Дзік;

начальнік аддзела развіцця і планавання НДР Галоўнага ўпраўлення навукі Н.Я. Чахлова;

намеснік начальніка навукова-інавацыйнага аддзела Галоўнага ўпраўлення навукі В.М. Карчэўская;

загадчык лабараторыі моцнатокавай электронікі НДІ ЯП В.І. Сталярскі;

загадчык лабараторыі радыёгалаграфіі НДІ ПФП, кандыдат тэхнічных навук І.А. Цітавіцкі;

намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ ФХП, кандыдат хімічных навук У.В. Сімірскі;

загадчыца НДЛ радыёхіміі хімічнага факультэта, кандыдат хімічных навук Г.А. Саколік;

галоўны навуковы супрацоўнік НДЛ аналітычнай і фізічнай хіміі фізічнага факультэта, доктар хімічных навук Р.Л. Старобінец;

загадчык НДЛ інфармацыйна-вымяральных сістэм факультэта радыёфізікі і электронікі, кандыдат тэхнічных навук І.П. Сцяцко;

загадчык НДЛ інструментальна-аналітычных тэхналогій пры кафедры фізічнага выхавання і спорту, кандыдат тэхнічных навук Б.М. Шпілявы.

Граматай ВАК Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя:

старшыня Савета па абароне дысертацый, член-карэспандэнт НАН Беларусі Ф.Ф. Камароў;

вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый І.І. Казімірская;

вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый А.А. Яноўскі;

начальнік аддзела атэстацыі кадраў вышэйшай кваліфікацыі Я.К. Бучурына;

старшыня экспертнага Савета ВАК Беларусі В.П. Рагойша;

старшыня Савета па абароне дысертацый С.В. Рашэтнікаў;

старшыня Савета па абароне дысертацый А.В. Шарапа;

начальнік аддзела аспірантуры і дактарантуры Л.П. Яноўская.

Ганаровымі граматамі БДУ ўзнагароджаны 137 чалавек, граматамі БДУ — 77 чалавек.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

29 лістапада 2001 года, чацвер, № 16-17 (1845-1846)

У НАШЫМ ДВАРЫ

Асветнік зямлі беларускай

У дворыку БДУ падчас юбілейных дзён з'явіўся новы помнік — постаць Кірылы Тураўскага заняла пачэснае месца паміж увасабленнямі іншых асветнікаў Беларусі.

Кірыла Тураўскі нарадзіўся на самым пачатку XII стагоддзя (недзе ў 1110-х гадах) у сям'і багатых бацькоў. Для свецкай кар'еры ў маладога, прывабнага, цікаўнага чалавека былі вельмі добрыя перспектывы. Але яго больш вабіла хрысціянская мудрасць. Верагодна, пад кіраўніцтвам нейкага "грэка" разумны юнак спасцігаў багацці візантыйскай і сусветнай культуры. Ён вывучаў грэчаскую мову, рыторыку, сусветную гісторыю, пісанні айцоў царквы (Іаана Залатавуснага, Кірылы Александрыйскага, Прокла Александрыйскага і інш.), агіяграфічную літаратуру. Тураў не быў вялікім кніжным цэнтрам і не меў сістэматычнай школы. Таму адметная адукаванасць Кірылы была выключэннем, а не правілам.

Праз некаторы час (напэўна, пасля смерці бацькоў) юнак вырашыў цалкам аддаць сябе служэнню Хрысту і прыняў пострыг у адным з тураўскіх манастыроў. Менавіта ў гэты манаскі перыяд жыцця выявіўся надзвычайны прамоўніцкі і літаратурны талент Кірылы. З-пад пяра асветніка выходзяць павучэнні манахам, малітвы, казанні (пропаведзі).

Каля 1148 года Кірыла Тураўскі поўнасцю адрынуў свет і закрыўся ў стаўпе. Гэты хрысціянскі подзвіг стоўпніцтва Кірыла прыняў дзеля наследавання дзеянняў святых айцоў-аскетаў з Блізкага Усходу і Візантыі. У адрозненне ад стоўпнікаў (якія ставілі свае келлі на платформе, што ўзвышалася на стаўпах над зямлёй), Кірыла закрыўся ў стоўпападобнай келлі-піргасе. Тут, у стаўпе, тураўскі пустэльнік, відавочна, стварыў каментарыі да Святога Пісьма. Як мяркуюць навукоўцы, у гэтых сваіх творах Кірыла Тураўскі выступаў не як арыгінальны багаслоў, а хутчэй як здольны кампілятар, які свядома абмяжоўваў праявы ўласнага "я", уласнай думкі.

Сваімі натхнёнымі творамі (а яшчэ больш — сваім праведным жыццём) Кірыла становіцца вядомы далёка паза межамі роднага тураўскага краю. Вынікам гэтага стала ўзвядзенне стоўпніка на епіскапскую пасаду ў Тураве прыблізна ў 1157 ці 1158 годзе. Новапастаўлены епіскап умела кіраваў епархіяй, наглядаў за гарадскімі манастырамі, навучаў у сваіх казанях мяшчанаў і святароў, гаварыў палымяныя прамовы супраць паганства, якое ў той час яшчэ вельмі моцна трымалася на тураўскіх землях.

Падчас змагання супраць ерасі ігумена Фёдарца, як мяркуюць некаторыя навукоўцы, Кірыла Тураўскі стварыў адзін са сваіх самых вядомых твораў — "Прыпавесць пра душу і цела" (іншыя лічаць, што твор напісаны ў больш ранні перыяд).

Аўтар жыція Кірылы Тураўскага адзначае, што тураўскі епіскап займаўся не толькі адміністрацыйнымі справамі сваёй епархіі, але не забываўся і на літаратурны занятак. Ён пісаў казані на святы, пахвалы святым, каноны... Сёння вядомыя шматлікія казані святога Кірылы на святы веліконага і пяцідзесятнага цыклаў, але ёсць меркаванне, што ён напісаў пропаведзі на ўсе вялікія святы.

Творы асветніка поўняцца шматлікімі стылістычнымі ўпрыгожаннямі, алегорыямі — часам вельмі маляўнічымі, але не надта арыгінальнымі: сам Кірыла пастаянна паўтараў, што ён і не імкнецца да арыгінальнасці, застаючыся верным Святому Пісьму.

Літаратурныя творы тураўскага епіскапа сталіся безумоўным адкрыццём для большай часткі яго сучаснікаў. Гэта і стала прычынай іх шырокай папулярнасці: існавалі шматлікія рукапісныя копіі казаняў, а пазней, з вынаходствам друкарскага станка, з'явіліся і друкаваныя кнігі. Дзякуючы гэтаму да нашага часу дайшло больш за 60 твораў тураўскага епіскапа — такая колькасць захаваных твораў сярэднявечнага аўтара падаецца проста неймавернай. Праўда, выказанае меркаванне пра мажлівае аўтарства "Слова пра паход Ігаравы", якое прыпісваецца Кірылу Тураўскаму, падаецца дастаткова неверагодным.

Апроч літаратурнай дзейнасці, на рахунку ў тураўскага епіскапа былі і іншыя значныя дасягненні. Ёсць усе падставы лічыць, што менавіта ягонымі намаганнямі ў XII стагоддзі быў узведзены вялікі сабор у Тураве, рэшткі якога знайшлі археолагі.

Падчас адкрыцця помніка *Фота Андрэя Дука*

На вялікі жаль, звесткі пра смерць Кірылы Тураўскага адсутнічаюць: невядома, ані калі сканаў тураўскі епіскап, ані дзе гэта здарылася. Вядома толькі, што ў 1184 годзе на тураўскай кафедры быў ужо пераемнік Кірылы — епіскап Лаўрэнцій. Сам жа "тураўскі Залатавуст" у гэты час, верагодна, яшчэ жыў, хаця ўжо і не быў епіскапам. Як мяркуюць даследчыкі, Кірыла Тураўскі пакінуў епіскапскі пасад і сышоў у адзін з гарадскіх манастыроў (верагодна, Барысаглебскі). Прычыны такіх паводзінаў невядомыя, і пра іх можна толькі здагадвацца, чытаючы горкія радкі "Слова", у якім святы Кірыла просіць не забываць сваіх настаўнікаў, маліцца за іх, быць ім удзячнымі.

Царкоўнае шанаванне святога Кірылы пачалося ў хуткім часе пасля яго смерці, што пацвярджае рукапісны "Саборнік" XII стагоддзя: тут змешчаныя некаторыя творы тураўскага епіскапа, а іх аўтар названы святым манахам. Не пазней чым яшчэ праз два стагоддзі з'явілася ў свет і жыціе святога Кірылы, а разам з тым — і служба святому, старажытныя спіскі якой не захаваліся да нашых дзён. І жыціе, і служба былі напісаныя, як можна меркаваць, у самім Тураве, бо святы Кірыла шанаваўся, відавочна, толькі на мясцовым узроўні. Невядома таксама, ці адбылася афіцыйная цырымонія кананізацыі тураўскага епіскапа. Зараз святкаванне памяці гэтага асветніка беларускай зямлі ў праваслаўнай царкве адбываецца 11 мая (паводле старога стылю 28 красавіка).

Падрыхтавана паводле кнігі А.А. Мельнікава "Путь непечален"

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

АДГУКНУЛІСЯ НА ЮБІЛЕЙ

Як паведамляла наша газета (№ 9 за 17 мая 2001 года), з нагоды 80-годдзя БДУ быў абвешчаны конкурс "Наш універсітэт", матэрыялы на якім ацэньваліся па трох намінацыях:

— лепшы артыкул з гісторыі БДУ,

— лепшая публікацыя на тэму "БДУ сёння",

— лепшы мастацкі твор (апавяданне, верш, эсэ і г.д.), прысвечаны БДУ.

Улічваючы шырокі рэзананс, які выклікаў юбілей БДУ, журы вырашыла пашырыць кола ўдзельнікаў конкурсу: акрамя матэрыялаў, прадстаўленых у рэдакцыю універсітэцкай газеты (згодна з Палажэннем), улічваліся і разглядаліся матэрыялы, прысвечаныя БДУ, што былі надрукаваныя ў іншых газетах і часопісах краіны.

Усяго было разгледжана журы 105 публікацый.

У намінацыі "З гісторыі БДУ" сярод найбольш значных можна назваць артыкул прафесара Э.Р. Іофе "Старэйшы універсітэт нашай краіны" ("Народная асвета", № 10, 2001 г.), артыкул прафесара Г.А. Браніцкага і дацэнта Т.П. Каратаевай "Хімічны факультэт у мінулым і цяперашнім" ("Вестник БГУ", серыя 2, № 3, 2001 г.), артыкул прафесара Р.Л. Старобінца "Хімічны факультэт у першыя гады яго існавання (Успаміны студэнта тых часоў)" ("Вестник БГУ", серыя 2, № 3, 2001 г.), артыкул прафесара Г.А. Браніцкага "Э.В. Змачынскі — першы дэкан хімічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта" ("Вестник БГУ", серыя 2, № 3, 2001 г.), публікацыю малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі У.В. Ляхоўскага "На шляху да стварэння універсітэта ў Беларусі" ("Беларускі гістарычны часопіс", № 4, 2001 г.). Акрамя таго, у газеце "Беларускі універсітэт" былі змешчаны ўрыўкі з кнігі былога дырэктара бібліятэкі БДУ І.У. Арахоўскай, што рыхтуецца да друку, — "Бібліятэчныя таямніцы" ("Беларускі універсітэт", № 10, 2001 г., № 12, 2001 г.).

З пералічаных вышэй артыкулаў навуковай грунтоўнасцю, гістарычнай значнасцю і цікавасцю вылучаецца публікацыя прафесара Г.А. Браніцкага "Э.В. Змачынскі — першы дэкан хімічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта".

У намінацыі "БДУ сёння" была разгледжана найбольшая колькасць артыкулаў. Са-праўды, для многіх рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі святкаванне БДУ стала нагодай для напісання інфармацыйных і больш грунтоўных матэрыялаў. Толькі за кастрычнік і пачатак лістапада гэтага года ў прэсе з'явілася каля 90 матэрыялаў розных жанраў. Вельмі шмат інфармацыі было ў СМІ пра тыя мерапрыемствы, якія праводзіліся падчас святкавання ў БДУ. На іх фоне больш сур'ёзна выглядаюць публікацыі аб розных факультэтах і структурных падраз-дзяленнях БДУ. Сярод апошніх можна выдзеліць артыкул Тамары Холад "У промнях першага універсітэта" ("Белорусская нива", 30.10.2001) пра геаграфічны факультэт і яго навукова-даследчую лабараторыю экалогіі ландшафтаў, якая вырашае і праблемы сяла.

Іна Нікіценка ў "Настаўніцкай газеце" (30.10.2001) у матэрыяле "Паэзія навукі і храм творчасці" цікава распавяла пра Ліцэй БДУ і яго заняткі ўжо ў новым будынку.

Заслугоўвае ўвагі інтэрв'ю Уладзіміра Хількевіча ў "Звяздзе" (23.10.2001) пад назвай "Юбіляр "прырастае" каледжам і гімназіяй". Аўтар не толькі пастараўся акрэсліць адметнасць навучання ў юрыдычным каледжы БДУ, але і закрануў нетрадыцыйныя падыходы ўзнікнення сярэднеспецыяльнай навучальнай установы як структурнага падраздзялення БДУ.

Надзея Страбкова ў "Чырвонай змене" (23.10.2001) зрабіла вялікае інтэрв'ю з дэканам факультэта журналістыкі В. Вараб'ёвым.

Акрамя гэтага ў газетах закраналіся праблемы універсітэцкай бібліятэкі, Музея гісторыі БДУ, студэнцкага гарадка, цэнтра праблем развіцця адукацыі БДУ. (На гэтыя тэмы ў асноўным пісалася ў "Чырвонай змене".) Прагучала інфармацыя аб факультэце фундаментальнай і нетрадыцыйнай медыцыны, фізфаку, а таксама цэнтры сучаснага стылю і моды Сашы Варламава, КВЗ БДУ, тэатры "На балконе", навукова-даследчай лабараторыі фальклору філфака.

Шмат матэрыялаў аб розных факультэтах БДУ выйшла ў "Вечернем Минске". Аднак амаль усе яны надрукаваны ў раздзеле "Аддзел рэкламы".

Вялікі ўклад у асвятленне новых методык выкладання ў БДУ, зразумела, унесла "Настаўніцкая газета", якая прадстаўляла свае газетныя палосы выкладчыкам БДУ.

Калі зважаць на надзённасць і маштабнасць выбраных журналістамі тэм, а таксама калі браць пад увагу прафесіяналізм аўтараў і тыя намаганні, якія яны прыклалі для таго, каб раскрыць значнасць універсітэта для краіны, дык сярод іншых можна выдзеліць інтэрв'ю Таццяны Падаляк "Калі стаяць на месцы, то можна спазніцца" ("Звязда", 30.10.2001), у якім раскрываецца асоба рэктара БДУ А.У. Казуліна. Артыкул Ганны Лагун "Павелічэнне экспарту адукацыйных паслуг. Ці магчыма гэта?" па праву можна назваць аналітычным. У ім не толькі раскрываецца сітуацыя з экспартам адукацыйных паслуг у нашай рэспубліцы, але і даюцца шляхі выхаду з крызісу на прыкладзе вопыту БДУ, які ўдала дзейнічае на міжнароднай арэне, карыстаецца папулярнасцю ў многіх краінах і прыцягвае ў свае сцены замежных студэнтаў. Матэрыял выйшаў не толькі ў газеце "Беларускі універсітэт", але і ў "Звяздзе", "Работе для вас".

Важную тэму для свайго інтэрв'ю "Ці можна атрымаць дызельнае паліва з рапсавага алею?" ("Рэспубліка", 30.10.2001) выбрала Мая Шэндрык. У матэрыяле закранаецца праблема развіцця інавацыйнай дзейнасці ў рамках класічнага універсітэта, што для многіх вышэйшых навучальных устаноў сёння пакуль нязвыкла.

У намінацыі "Лепшы мастацкі твор, прысвечаны БДУ" на конкурс былі прадстаўлены: апавяданне студэнткі 5-га курса завочнага аддзялення факультэта журналістыкі К. Пучынскай "Кампазіцыя ў стылі", апавяданне студэнткі 1-га курса факультэта журналістыкі К. Харынай "Прафесар пакрыўдзіўся...", эсэ студэнткі 2-га курса факультэта міжнародных адносін В. Бычкоўскай "БДУ вачыма філосафа", верш у прозе студэнткі 2-га курса юрыдычнага факультэта М. Картавіцкай "Мой універсітэт".

З вышэй пералічаных больш цікавым падаецца апавяданне К. Пучынскай "Кампазіцыя ў стылі".

Падвёўшы вынікі конкурсу, журы вырашыла размеркаваць прызавыя месцы наступным чынам:

у намінацыі **"Лепшы артыкул з гісторыі БДУ"**

I месца — Г.А. Браніцкі (дэкан хімічнага факультэта БДУ) за артыкул "Э.В. Змачынскі — першы дэкан хімічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта";

II месца — У.В. Ляхоўскі (м.н.с. Інстытута гісторыі НАН Беларусі) за артыкул "На шляху да стварэння універсітэта ў Беларусі";

III месца — І.У. Арахоўская (былы дырэктар бібліятэкі БДУ) за ўрыўкі з кнігі "Бібліятэчныя таямніцы";

у намінацыі **"Лепшая публікацыя на тэму "БДУ сёння"**

I месца — Т.У. Падаляк (рэдактар аддзела культуры газеты "Звязда") за серыю матэрыялаў пра БДУ, а таксама за інтэрв'ю "Калі стаяць на месцы, то можна спазніцца";

II месца — Г.А. Лагун (карэспандэнт газеты "Беларускі універсітэт") за серыю матэрыялаў пра БДУ, а таксама за артыкул "Павелічэнне экспарту адукацыйных паслуг. Ці магчыма гэта?";

III месца — М.М. Шэндрык (рэдактар аддзела навукі, адукацыі і экалогіі газеты "Рэспубліка") за інтэрв'ю "Ці можна атрымаць дызельнае паліва з рапсавага алею?";

у намінацыі **"Лепшы мастацкі твор, прысвечаны БДУ"**

I месца вырашана не прысуджаць нікому;

II месца — К.М. Пучынская (студэнтка V курса завочнага аддзялення факультэта журналістыкі) за апавяданне "Кампазіцыя ў стылі";

III месца — К.А. Харына (студэнтка I курса факультэта журналістыкі) за апавяданне "Прафесар пакрыўдзіўся".

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

29 лістапада 2001 года
Зак. 289.
Тыраж 1000 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6 Ум. друк. арк. 2

Падпісана да друку 28.11.2001

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.